**ФАРМІРАВАННЕ СІСТЭМЫ МАРАЛЬНЫХ КАШТОЎНАСЦЕЙ ВУЧНЯЎ СРОДКАМІ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»**

***Рыбакова І.А.,*** *настаўнік беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія №71 г.Гомеля"*

Хороший учитель не знает, как будет развиваться урок во всех его тонкостях и деталях; не знает не потому, что он работает вслепую, а потому, что он очень хорошо знает, что такое хороший урок.

Василий Сухомлинский

Мастерство – это когда «ЧТО? и «КОГДА?» приходят одновременно.

Прыярытэтнымі задачамі ўрокаў роднай мовы і літаратуры кожны навучальны год акрэслены наступныя :

- фарміраванне ў вучняў патрыятычных каштоўнасных арыентацый;
- фарміраванне маральных каштоўнасных арыентацый;
- захаванне нацыянальнай ідэнтычнасці;
- прывіццё любові і павагі, свядомага стаўлення да мовы як духоўнай каштоўнасці;
- літаратурная адукацыя вучняў.

Рэсурсы, якія забяспечваюць выхаваўчы патэнцыял на ўроках роднай мовы і літаратуры будуць наступныя:

1) інфармацыйны рэсурс (культуразнаўчыя тэксты, тэксты патрыятычнага і грамадзянскага зместу, экранізацыя мастацкіх твораў);
2) метадычны рэсурс (актыўныя метады і формы навучання: гутаркі, публічныя выступленні, дыскусіі, дыспуты, паведамленні, стварэнне відэаролікаў і інш.);
3) сацыяльны рэсурс (асобасныя адносіны паміж настаўнікам і вучнямі).

Канечне, вялікую ролю адыгрывае сацыяльны рэсурс, што падразумявае адносіны паміж настаўнікам і вучнямі, але мы спынімся на метадычным рэсурсе.

Якімі ж шляхамі трэба ісці настаўніку, каб выхаваць у вучняў асобасныя каштоўнасці, мы пастараемся расказаць на прыкладзе аднаго структурнага элемента вучэбнага занятку – арганізацыйна- матывацыйнага. Вялікая ўвага ў пачатку ўрока настаўнікамі-філолагамі надаецца эпіграфам і прытчам. Гэта як запеў ў песні, гэта тое, на што трэба звярнуць увагу адразу!

**Наладжваецца размова з выхаванцамі.**

"Добры дзень, рабяты! Сядайце! Я раскажу вам адну прытчу, а вы ўважліва паслухайце яе і скажыце, пра што пойдзе сёння гаворка на нашым уроку…

… У аднаго селяніна былі дзве сахі. Абедзве яны былі аднолькавыя. Але адну саху селянін браў з сабою ў поле, а другая заставалася стаяць у куточку.

Саха, якая выкарыстоўвалася ў працы, была прыгожай, бліскучай. Другая ж пачынала іржавець. Аднаго разу сяброўкі сустрэліся.

– Скажы, чаму ты такая прыгожая? – спытала першая. А я ўвесь час прастаяла ў куточку, і паглядзі, што са мной сталася.

– Гэта безрабоцце цябе згубіла, – адказала ёй сяброўка".

Вучні, аналізуючы прытчу, прыходзяць да высновы, што праца робіць чалавека прыгажэйшым. Дзякуючы працы, чалавек узбагачаецца і духоўна і матэрыяльна. Такім чынам, мы хочам вам паказаць на прыкладзе аднаго з любімых жанраў у літаратуры – прытчы, у змесце якой схаваны пэўны маральны сэнс, раскрываючы які, вучні самі акрэсліваюць тэму ўрока, яго **выхаваўчую задачу: прывіццё пачуцця павагі да звычайнага простага чалавека працы.** (Названы прыём выкарыстоўваецца пры вывучэнні апавядання З.Бядулі "Бондар", 10 клас).

Узбагачэнню духоўнага свету вучняў, выхаванню ў іх такіх якасцей, як спачуванне, суперажыванне, асэнсаванне свайго месца ў свеце на такіх уроках як "**Сена на асфальце" М.Стральцова, З.Бядулі "На Каляды к сыну"** садзейнічае наступная прытча:

…Аднойчы мудраца спыталі: У чым сакрэт вашай мудрасці? Ён адказаў: «Калі людзі шукаюць іголку ў стозе сена, то большасць спыняецца, як толькі знойдзе яе. А я працягваю пошукі, знаходзячы другую, трэцюю, чацвёртую…» Выснова, якую бачаць дзеці – ніколі не трэба спыняцца на дасягнутым, трэба шукаць сябе.

Але, мы лічым, першасная задача настаўніка-філолага – выхаванне на ўроках мовы і літаратуры патрыятыятычных каштоўнасцей, павагі да гістарычнага мінулага свайго народа. На вучэбных занятках па літаратуры вялікая роля адводзіцца таксама праблеме генацыду беларускага народа з апорай на ўласны вопыт, дакумельныя факты.

**С**воеасаблівым запевам на такіх вучэбных занятках служаць эпіграфы:

Я вас прашу, не зведаў хто вайны,
Прашу вас, мае дочкі і сыны,
Узяць хоць долю памяці маёй –
Каб потым ёй не зарасці травой.

А.Вярцінскі

Зразумела, што нашым вучням няцяжка раскрыць сэнс эпіграфа і падвесці яго пад тэму ўрока. Але для многіх назва тэмы можа і застацца проста назвай, калі не дакрануцца яны сваёй душой да таго, што перажыў наш народ. Вельмі ўдзячны матэрыял на матывацыйным этапе ўрока можна ўзяць з экскурсій, праведзеных раней. Так, у мінулым годзе вучні 11, 8 класаў пабывалі на экскурсіі ў мемарыяльным комплексе "АЛА". На матэрыяле экскурсіі былі напісаны эсэ "Па кім звоняць званы?". На ўроках, дзе вывучаюцца творы **Я.Брыля ("MEMENTO MORI"), Васіля Быкава**, своеасаблівым эпіграфам гучалі іменна словы з вучнёўскіх сачыненняў, гучалі вельмі прачула, узнёсла.

Вось некалькі такіх вучнёўскіх эпіграфаў:

“Вёска Ала… Яе няма на карце. Яе няма ў спісах населеных пунктаў. У ёй няма святла і электрычнасці, няма сувязі. У ёй няма жыцця. Толькі адчуваецца пах дыму, толькі чуюцца крыкі і плач. Не засталося на гэтай зямлі нічога, па чым можна тужыць і ліць горкія слёзы. Ала жыве ва ўспамінах”. (Каця Баландзенка).

“У самым канцы плошчы мемарыяьнага комплексу вырастае высокі, да неба, крыж. Тонкі, як запалка, чорны, як вугаль. Побач з ім – звон. Калі пройдзеце ўвесь пакутны шлях да гэтага месца, мабыць, хопіць у вас сілы ўдарыць у яго. Тады ён ускрыкне, застогне, заплача. І гэты плач разляціцца па лесе, па ўсёй Беларусі, па свеце. Змоўкнуць птушкі, усе сціхне, каб даць хвіліну на ўспамін. І пранясецца ў галаве думка: “Па кім звоніць гэты звон?!” (Галя Кучарэнка).

І няхай крыху больш хвілін, чым патрабуе арганізацыйны этап урока, зоймуць выступленні рабят, але гэта таго каштуе!

І праграма па літаратуры 6 класа прадугледжвае вывучэнне твораў па раздзеле падручніка “Вайна – боль і памяць народа”.

Было ў салдата два полі,
поле, дзе кветкі збіраў,
бегаў з сябрамі на волі,
і поле, дзе ён паміраў

А.Вярцінскі

Эпіграфам да ўрока “Было ў салдата два полі” А.Вярцінскага сталі выступленні рабят-шасцікласнікаў. Хачу прывесці прыклад выступлення Івана Вярэніча. Ён зачытаў толькі адзін маленькі дакумент, які беражліва захоўваецца ў яго сям’і.

“Асноватворчым падмуркам любога ўрока літаратуры з’яўляецца непасрэдная праца з тэкстам мастацкага твора, які становіцца адпраўным пунктам ў працэсе бесперапыннага выхавання” (з Метадычнага пісьма Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь). Іменна тэкст развівае чытацкую граматнасць, дапамагае вучням разабрацца ў вялікім моры паўсядзённай інфармацыі. Мастацкі твор – гэта своеасаблівы мост паміж аўтарам і чытачом. Разумеючы пункт гледжання пісьменніка, раскрываючы праблемны змест тэксту, вучань спазнае сябе. А ўрок – гэта мэтанакіраванае дзеянне і дыялог настаўніка і вучняў, у ходзе якіх выпрацоўваецца тая ці іншая жыццёвая стратэгія, фарміруюцца пэўныя рысы характару, набываюцца тыя ці іншыя звычкі паводзін. Вельмі каштоўнымі лічу заданні апераджальнага характару, якія потым выкарыстоўваюцца на першым этапе ўрокаў. Я маю на ўвазе невялікія буктрэйлеры, знятыя самімі вучнямі. З вялікай цікавасцю вучні праглядваюць іх, робяць заўвагі, даюць ім ацэнку і становяцца самі ўдзельнікамі тых падзей, якія аўтар спрабуе данесці да нас. Так фарміруецца чытацкая граматнасць. Прапаную вам адзін з такіх буктрэйлераў. **(дэманстрацыя відэароліка).**

Яшчэ адзін дзейсны прыём, які не пакідае вучняў раўнадушнымі, - удзел іх саміх у відэаэпізодзе, знятым па матэрыяле прачытанай кнігі, а для астатніх – гэта роздум над вечнымі пытаннямі чалавечага быцця: хто такі сапраўдны сябар, якім павінна быць першае пачуццё кахання, як быць, калі цябе не разумее каханы чалавек? Іменна гэтыя маральна-этычныя задачы і з’яўляюцца прыярытэтнымі на ўроках беларускай літаратуры ў 10, 11 класах пры вывучэнні твораў сучаснай беларускай літаратуры.

**(відэаролік па кнізе В.Гапеева “Мая мілая ведзьма”)**

Дапамагчы вучням дасягнуць такога ўзроўню разумення жыцця, каб яны духоўна выраслі, адчулі сябе творчай, актыўнай і патрэбнай асобай у грамадстве заклiканы ўрокі роднай мовы і літаратуры. У праграме ёсць раздзел «Літаратура як чалавеказнаўства». На маю думку, урокі літаратуры – гэта і ёсць курс чалавеказнаўства.